ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
19
КАСТРЫЧНІКА
№ 27(1620)

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

ДЗЕ ВЫЙСЦЕ З ЛАБІРЫНТА?

Стаць журналістам я марыў з самага дзяцінства. Пра гэта сведчаць малюнкі, зробленыя ў малодшых класах, на тэму «Мая будучая прафесія». На іх я заўсёды маляваў сябе з фотаапаратам і дыктафонам.

І вось мая мара ажыццявілася — я стаў студэнтам БДУ. Але пасля кароткага часу вучобы першыя ўражанні быццам раздваіліся. З аднаго боку ён (БДУ) застаецца гордым, з моцным характарам, з другога — пакінутым сам-насам са сваім жыццём.

Моц універсітэта адчуваецца ў тым, што вучоба ў ім лічыцца за гонар — аб гэтым сведчыць конкурс у час уступных экзаменаў. З ахвотай вучацца ў нас і замежныя студэнты. І ўсё было б выдатна, калі б не праблемы, якія не вырашаюцца з году ў год, перашкаджаюць спакойна жыць і працаваць.

Першае, з чым мне давялося сутыкнуцца,— недахоп месцаў у інтэрнаце. І здарылася так, што мы, першакурснікі, засталіся адзін на адзін з незнаёмым горадам, а таксама з думкай: дзе жыць? Кожны вымушаны быў вырашаць гэта пытанне самастойна.

Што яшчэ выклікала вялікія нязручнасці — гэта раскіданасць факультэтаў. У першыя дні было цяжка арыентавацца. А пра свой факультэт і наогул не хочацца гаварыць: нас прытуліў наргас. Кажуць, у цеснаце ды не ў крыўдзе. Але добра, калі гэта не ўплывае на вучобу. А ў нас?

Яшчэ да паступлення ў БДУ я пацікавіўся, як тут справы з беларускай мовай. І пачуў абнадзейваючае тлумачэнне: маўляў, палова лекцый будзе чытацца па-беларуску. Бачыце, нават уступны экзамен па роднай мове ёсць. Але правучыліся мы ўжо больш месяца, а беларускіх лекцый я так і не пачуў. Хацелася б спытаць, ці доўга яшчэ будзем чакаць, калі выкладчыкі, нарэшце, загавораць па-беларуску?

Каб неяк запоўніць гэты прабел, вырашыў звярнуцца ў студэнцкі клуб. Адзінае, што мне змаглі тут прапанаваць,—фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш». На жаль, стаць яго ўдзельнікам я не змог — не валодаю артыстычнымі данымі. Ды і наогул, «Неруш» размаўляе па-беларуску толькі на сцэне, а ў час рэпетыцый гэту мову забываюць.

Нядаўна, праўда, пачуў прыемную навіну: праблема беларускай мовы зрушылася з «мёртвай кропкі» — у БДУ створана Таварыства беларускай мовы. Але ці стане гэта арганізацыя такой, якой павінна быць? Баюся, каб не ператварылася Таварыства ў яшчэ адну «арганізацыю для галачкі». Таму асабіста я не спяшаюся ўступаць у ТБМ, лічу, што тым, што размаўляю на роднай мове, прыношу больш карысці.

Вось такі лабірынт праблем атрымліваецца.

С. СЯНКЕВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

З другакурснікам мехмата Пятром Дзяшкевічам сустрэцца і пагаварыць атрымалася толькі на бягу. Справы. І ўвогуле, ён стараста, але, калі трэба, да Пятра сакурснікі ідуць і з камсамольскімі, і з прафсаюзнымі праблемамі. Ён якраз з тых людзей, якіх не абмінаюць клопаты сяброў, якія усё прапускаюць праз сябе.

Фота С. ГРЫЦА.

Сябры сустрэліся зноў

Чытачы «Беларускага універсітэта» ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца з інфармацыяй аб рабоце курсаў павышэння кваліфікацыі для выпускнікоў-замежнікаў («Беларускі універсітэт» за 28 верасня).

Ліст студэнта-замежніка ШАРЛЯ МАЙЕКУ паведамляе аб іх больш падрабязна.

— Тэмы нашых курсаў асвятлялі асноўныя пытанні і актуальныя праблемы сродкаў масавай інфармацыі ў святле галоснасці і перабудовы,— пачала свой расказ намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі А. А. Рудэнка.—Для чытання лекцый мы запрасілі (акрамя сваіх выкладчыкаў) практычных работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды. Але мы разумелі, што самыя трывалыя веды набываюцца на практыцы. Таму і прапанавалі нашым слухачам пайсці ў рэдакцыі газет, часопісаў, на радыё і тэлебачанне і ўласнымі вачыма ўбачыць тыя змены, якія адбыліся за гады перабудовы.

Патрэбна сказаць, што курсы атрымалі высокую ацэнку слухачоў. Вось, напрыклад, што сказаў выкладчык Вышэйшай партыйнай школы ў В'етнаме Нгуен В'ет П'ек:

— Перш за ўсё дзякую ўсім, хто даў нам магчымасць прыехаць сюды. Карысць курсаў у тым, што яны дапамагаюць нам быць у курсе падзей, якія адбываюцца ў вашай краіне. Больш таго, мы можам увачавідкі ўбачыць, як ідзе ў вас працэс перабудовы грамадства.

Садзех Мутана Амар заўважыў, што арганізацыя курсаў павышэння кваліфікацыі — вялікая падзея для замежных студэнтаў.

— Тут мы зноў сустрэліся з сябрамі. Вельмі цікава было даведацца, хто дзе працуе, што паспеў зрабіць, чаго дасягнуў кожны з нас пасля заканчэння вучобы ў Савецкім Саюзе. А яшчэ вельмі прыемна было сустрэцца з выкладчыкамі, якіх не бачылі так доўга.

Слухачы курсаў былі адзінымі ў сваіх выказваннях аб тым, што арганізацыю такой вучобы неабходна практыкаваць і надалей.

ПІНГ-ПОНГ

ШУКАЕМ ВІНАВАТЫХ?

У дзень, калі набіраўся апошні выпуск «Аўдыторыі № 7» (27.09.89), мы прачыталі публікацыю карэспандэнтаў ТАСС А. Вальвачова і Г. Новікава «Грошы на барабан». Тон яе адкрыта дысаніраваў з матэрыялам нашага няштатнага карэспандэнта С. Шапрана «Канцэрт не адбыўся, але...»

Каму верыць?

Не ў меншай разгубленасці быў і чытач, тым больш, што 30 верасня артыкул «Грошы на барабан» надрукавала «Комсомольская правда». Мяркуючы па тэлефонных званках у рэдакцыю, «шматтыражка, абараняючы каманду Белавусава, паспяшалася з публікацыяй». Тым, хто па-ранейшаму ў гэтым упэўнены, раім прачытаць артыкул Ю. Філінава «Шоўшулеры» («Комсомольская правда», 15.10.89).

ДА ЎВАГІ ВУЧОНЫХ САВЕТАЎ ФАКУЛЬТЭТАЎ

Слова за студэнтамі

З сёлетняга навучальнага года ва універсітэце распачала сваю працу кафедра беларускай мовы і літаратуры для факультэтаў, дзе гэтыя дысцыпліны не з'яўляюцца прафіліруючымі.

Курсы роднай мовы і літаратуры чытаюцца на педагагічных патоках усіх факультэтаў.

Улічваючы своеасаблівую і ўсеагульную нашу сённяшнюю цікавасць да гісторыі і культуры, мовы і літаратуры, да мастацтва і нацыянальных народных традыцый Беларусі, імкнучыся паўней спатоліць ўсё ўзрастаючую і ўпаўне натуральную прагу далучэння кожнага да нацыянальных духоўных набыткаў свайго народа, рост нацыянальнай самасвядомасці ў асяроддзі студэнцкай моладзі, кафедра прапануе курс лекцый па «Асновах беларусазнаўства». Ён можа чытацца ў розным аб'ёме. Асобныя тэмы могуць быць разгорнуты і пашыраны. Прымаюцца і сустрэчныя прапановы саміх студэнтаў і вучоных саветаў, напрыклад, аб больш паглыбленым і дасканалым вывучэнні беларускай мовы, літаратуры, фальклору, традыцый, гісторыі, мастацтва і г.д.

Курс можа быць факультатыўным на вытворчых патоках, на юрыдычным факультэце, факультэце радыёфізікі і электронікі, пачынаючы з другога семестра гэтага навучальнага года.

Студэнцкія акадэмічныя групы, калектывы курсаў могуць увайсці з хадайніцтвам ў саветы факультэтаў аб увядзенні падобнага курса.

З прапановамі і заяўкамі звяртайцеся праз рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт», тэл. 20-68-27.

У. НАВУМОВІЧ,
в.а. загадчыка кафедры беларускай мовы і літаратуры.

ТЭМАТЫКА

лекцый па «Асновах беларусазнаўства» для факультэтаў, на якіх беларуская мова не з'яўляецца прафіліруючай дысцыплінай.

1. Старажытная Беларусь.
2. З гісторыі ўтварэння і развіцця беларускай мовы.
3. Стан сучаснай беларускай мовы, яе гістарычны лёс і перспектывы развіцця.
4. Кнігадрукаванне на Беларусі.
5. Беларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім (XV—XVI ст. ст.).
6. Беларускае слова ў народным друку ў XIX — пачатку XX стагоддзя.
7. Генетычная роднасць і паралельнае развіццё беларускай, рускай і ўкраінскай моў. Агульнае і адметнае.
8. Дыскусіі аб мове ў 20—30-я гады XX стагоддзя.
9. Беларускі фальклор.
10. Беларускае вяселле.
11. Беларуская літаратура ў кантэксце літаратур народаў свету.
12. Літаратурны рух на Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя. Дзейнасць літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя».
13. Янка Купала, Якуб Колас і «Маладняк».
14. Янка Купала і Якуб Колас. Агульнае і рознае.
15. М. Багдановіч — класік беларускай літаратуры.
16. Канцэпцыя чалавека ў беларускай савецкай літаратуры.
17. Сучасная беларуская паэзія ў святле традыцый і наватарства.
18. Беларуская гістарычная проза.
19. Беларуская проза аб вайне.
20. Праблемы «вясковай» прозы.
21. Маральна-этычныя праблемы ў сучаснай беларускай прозе (дабра і зла, асабістых узаемаадносін, сям'і, шлюбу, кахання).
22. Экалагічныя праблемы ў сучаснай беларускай літаратуры.
23. Беларуская нацыянальная драматургія.
24. Жанрава-стылёвыя пошукі ў беларускай прозе.
25. Літаратура і перабудова.
26. Мастацтва Беларусі. Адраджэнне нацыянальных традыцый.
27. Беларусь у свеце.

ТЭЛЕТАЙП

НА ПАСЯДЖЭННІ

прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ імя У. І. Леніна прынята рашэнне аб правядзенні XXVIII справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі. Яна адбудзецца 3 лістапада а 15-й гадзіне. Пачатак рэгістрацыі — у 14.00.

Акрамя таго, прысутныя заслухалі справаздачу аб рабоце прафсаюзнага камітэта універсітэта і рэвізійнай камісіі за тры апошнія гады.

Вырашаны і некаторыя арганізацыйныя пытанні.

Т. ДОЎНАР.

ЗЛЁТ ВЫДАТНІКАЎ

прайшоў у пачатку гэтага месяца ў Стайках. На яго сабралася 70 замежных студэнтаў. Па водгуках многіх мерапрыемства ўдалося. Было яно афіцыйна-займальным: навучэнцаў запрасілі прыняць удзел у «круглым стале» на тэму «Ленін і перабудова», у абмеркаванні праблем павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для замежных краін, а таксама ў спаборніцтвах па валейболу, баскетболу, а вечарам — доўгачаканая дыскатэка.

Але асабліва памятным стаў злёт для тых, хто захапляецца спортам: адзінацаць пераможцаў гарадской спартакіяды сярод замежных студэнтаў атрымалі ўзнагароды — медалі, граматы і каштоўныя падарункі.

— Шкада было пакідаць гэтыя цудоўныя мясціны і зноў вяртацца да будзённага жыцця,— паскардзіўся адзін знаёмы замежнік.— Але праз год сустрэнемся зноў.

З. МІХНЕВІЧ.

«ЗАПРАШАЕ КВЗ!»

— такія аб'явы можна сустрэць у самым нечаканым месцы. Калі вы любіце жарты, дасціпны і тонкі гумар, вас чакаюць 21 кастрычніка ў 18.30 у Доме палітасветы. Вы станеце гледачамі суперфінала-89, у якім каманда КВЗ МРТІ выступае супраць клуба КВЗ.

М. ТАРАСАВА.

ПАДТРЫМАЛІ ТРАДЫЦЫІ

сваіх старэйшых таварышаў і заваявалі званне чэмпіёна універсітэта сёлетнія першакурснікі факультэта журналістыкі. Яны сталі пераможцамі лёгкаатлетычнага кросу. Ім уступілі студэнты першага курса геаграфічнага факультэта і механіка-матэматычнага.

Асабліва спрытнымі аказаліся А. Дзмітрыеў, А. Дарошка, А. Хабараў, І. Шалепава, Т. Казак, Н. Курапаткіна.

Л. АРТАМОНАВА.



Чарнобыль. Праз тры з паловай гады гэта слова не стала менш балючым. Чарнобыльская трагедыя прымусіла кожнага з нас усур'ёз задумацца над пытаннем: як зрабіць паветра, якім мы дыхаем, ваду, якую мы п'ём, чыстымі? Словам, як выжыць?

— Але экалогія — гэта не толькі Чарнобыль,— не без падстаў заявілі ўдзельнікі адкрытай дыскусійнай трыбуны на тэму «Экалогія і мы», якая прайшла на мінулым тыдні ў нашым універсітэце і сабрала людзей зацікаўленых, неабыякавых, па-сапраўднаму заклапочаных лёсам чалавецтва.— Гэта нітраты, пестыцыды, загазаванасць нашых гарадоў...

У размове прынялі ўдзел: загадчык кафедры рацыяцыйнай хіміі, віцэ-прэзідэнт Беларускага экалагічнага саюза, прафесар Я. П. Пятраеў; дацэнт кафедры аналітычнай хіміі, кандыдат хімічных навук Я. М. Рахманько; загадчык лабараторыі лазерна-лакацыйных сістэм НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, кандыдат тэхнічных навук Д. А. Ашкінадзе; навуковы супрацоўнік кафедры радыяцыйнай хіміі, кандыдат тэхнічных навук В. М. Гарбачоў; дэкан спецфакультэта «Экалогія, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў», кандыдат біялагічных навук Л. М. Лук'яновіч; намеснік дырэктара НДІ ядзерных праблем, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар М. М. Шумейка; вядучы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП, доктар хімічных навук А. І. Шадыра; доктар эканамічных навук, прафесар кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін А. У. Тамашэвіч; кандыдат хімічных навук, асістэнт кафедры агульнай хіміі К. М. Лапко; студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі В. Панцялееў; кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік кафедры біяфізікі Л. К. Герасімава; загадчык галіновай навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства А. М. Рачэўскі; загадчыца кафедры агульнай экалогіі, доктар біялагічных навук Н. М. Кручкова; кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры ядзернай фізікі А. М. Люцко; кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры гісторыі, філасофіі і логікі Г. У. Грушавы; сакратар парткома БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат фізіка-матэматычных навук В. А. Гайсёнак і іншыя.

ЭКАЛОГІЯ І МЫ: ЯК ВЫЖЫЦЬ?

Я. П. ПЯТРАЕЎ: Было б няправільным такую сур'ёзную праблему, як экалогія, аддаць на водкуп нефармальным арганізацыям ці не зусім арганізаванаму Беларускаму экалагічнаму саюзу. Для больш паспяховай работы пажадана аб'яднаць нашы намаганні, стварыўшы, напрыклад, ва універсітэце буйны навуковы экалагічны цэнтр. Прааналізаваўшы навуковую работу, якая вядзецца ў нас, можна сцвярджаць, што БДУ займае вядучыя пазіцыі ў пытаннях зандзіравання атмасферы, даследавання яе забруджанасці. Што датычыць вывучэння Чарнобыльскай праблемы, то тут нам таксама ёсць што сказаць.

Я. М. РАХМАНЬКО: Часта можна пачуць, што праблемы Чарнобыля і нітратаў нельга аб'ядноўваць. Але, як ні дзіўна, яны ўзаемазвязаны. Па-першае, нітраты, трапіўшы ў наш арганізм, узмацняюць эфект радыяцыі. Па-другое, і радыяцыйныя часціцы, і нітраты прыводзяць да розных цяжкіх захворванняў.

Спынюся на нітратах у пітных водах. Да сённяшняга дня праблему гэту стараюцца абыходзіць бокам, не ўзнімаюць у друку. А гаварыць ёсць аб чым. 90 працэнтаў калодзежаў (я буду весці размову толькі пра нашу рэспубліку) утрымліваюць столькі нітратаў, што ваду з іх піць нельга. Калі дапушчальная норма 44 мг на літр, то мы маем каля 200—300 мг, а сустракаюцца нават і такія, дзе гэта колькасць дасягае аднаго грама. Прыгадайце, колькі літраў вады мы ўжываем за дзень, і вы зразумееце, якая небяспека нам пагражае. Па маіх падліках, каля паловы насельніцтва асноўную дозу нітратаў атрымлівае з вадой.

У чым жа выйсце? Лічу, што пітную ваду патрэбна рыхтаваць спецыяльна (кожнаму чалавеку яе спатрэбіцца прыкладна ў сто разоў менш, чым вады санітарна-бытавога прызначэння). На Кубе, напрыклад, гэта праблема ўжо вырашана. Ваду там рыхтуюць на спецыяльным заводзе і прадаюць за даволі невысокую цану насельніцтву. Арганізаваўшы водазабеспячэнне гараджан такой вадой, можна было б калі не поўнасцю пазбегнуць атручвання людзей шкоднымі рэчывамі, то хоць крыху знізіць яго.

Мінскую ваду мы атрымліваем з дзвюх крыніц — гэта глыбакаводныя свідравіны і паверхневыя воды. Калі гаварыць аб нітратах, то яны складаюць невялікую канцэнтрацыю. Значна горш справы з наяўнасцю цяжкіх металаў, пестыцыдаў. Даволі часта сустракаюцца выпадкі, калі канцэнтрацыя іх перавышае дапушчальныя нормы. Асабліва небяспечным для нашага здароўя з'яўляецца тэтрахлордыаксін — на думку вучоных, самае таксічнае рэчыва, утварэнню якога спрыяе, дарэчы, хларыраванне вады. На жаль, у нашай краіне гэтай праблемай амаль ніхто не займаецца. Не распрацавана ў нас і методыка, якая б дазволіла вызначыць наяўнасць гэтага шкоднага рэчыва.

Д. А. АШКІНАДЗЕ: Мяне вельмі хвалюе праблема забруджанасці атмасферы. Асабліва ўразілі даныя, атрыманыя ў Наваполацку. Канцэнтрацыя шкодных рэчываў тут перавышае норму ў сотні разоў. У нас нямала такіх прадпрыемстваў, якім выгадней заплаціць штраф, чым клапаціцца аб ахове навакольнага асяроддзя.

Сёння супрацоўнікі лабараторыі лазерна-лакацыйных сістэм заканчваюць работу над распрацоўкай сучаснай устаноўкі для вымярэння NO_2. Думаю, укараненне яе дапаможа ў вырашэнні экалагічнай праблемы.

Мы праводзілі даследаванне атмасферы ў Мінску. Вынікі несуцяшальныя. У нас прынята лічыць раён вёскі Шчамысліца чыстым. Ці так на самай справе? Непадалёку знаходзіцца навукова-вытворчае аб'яднанне «Інтэграл». Экалагічная пагроза ад яго вялікая.

Я думаю, кіраўніцтва прадпрыемстваў патрэбна паставіць у такія ўмовы, каб яно вымушана было клапаціцца аб ахове навакольнага асяроддзя. Для гэтага, безумоўна, неабходны сродкі. І ў першую чаргу тым, хто зможа прымяніць іх па прызначэнню. У нас ва універсітэце таксама добра было б наладзіць строгі кантроль за фінансаваннем навуковых даследаванняў, якія вядуцца ў гэтым напрамку.

В. М. ГАРБАЧОЎ: Я хацеў бы спыніцца на прынцыпах арганізацыі вырашэння экалагічных праблем у рэспубліцы. Нядаўна быў створаны Беларускі экалагічны саюз. Але пакуль мы не бачым ніякіх рэальных зрухаў у экалагічнай сітуацыі, ніякіх канкрэтных акцый. Ва універсітэце таксама зроблена спроба стварыць экалагічную групу. Пакуль гэта толькі словы. І зразумела чаму: на голым энтузіязме можна сабрацца раз, другі, паразмаўляць, узняць праблемы, але потым, калі паўстане пытанне аб вырашэнні нейкіх канкрэтных задач, патрэбны фінансы, навуковыя сілы. Я бачу вырашэнне праблемы ў стварэнні пазаўрадавага органа на ўзроўні Вярхоўнага Савета рэспублікі. Гэта мог бы быць пастаянны камітэт па праблемах экалогіі з падкамітэтам па вырашэнню пытанняў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Якія правы яму неабходны: па-першае, магчымасць стварэння арганізацыі, здольнай ажыццяўляць пастаянны экалагічны кантроль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Адкуль узяць на гэта грошы? Бюджэт наш зараз, як вядома, у катастрафічным стане. На мой погляд, мэтазгодна было б стварыць пад эгідай пастаяннага камітэта незалежную экспертную арганізацыю, якая магла б накладваць штрафы (не сімвалічныя!) на прадпрыемствы, што парушаюць экалагічны рэжым. Прычым, мэтавым паступленнем яны ішлі б непасрэдна ў распараджэнне гэтай камісіі. Важную ролю павінен адыграць Беларускі экалагічны саюз. Гэта арганізацыя, якая аб'ядноўвае вучоных-аднадумцаў, магла б на гасразліковых пачатках аказваць прадпрыемствам паслугі, звязаныя з паляпшэннем экалагічнай абстаноўкі.

Л. М. ЛУК'ЯНОВІЧ: Першы вопыт грамадскага руху паказвае, што там, дзе намаганні народа дастаткова актыўныя, ёсць пэўныя зрухі. Так было, напрыклад, з дубровай у Шчамысліцы. Тэхнакраты сцвярджалі, што змагацца за яе захаванне няма сэнсу: усё роўна яна загіне. Але на яе абарону сталі мінчане, і ім удалося зберагчы ўнікальны помнік прыроды.

Хачу сказаць, любая камісія, нават створаная пры Вярхоўным Савеце, не зможа дайсці да кожнага месца, размеркаваць фонды ўсёй рэспублікі. Камісія, магчыма, патрэбна, але ёсць органы, якія кантралююць навакольнае асяроддзе. Напрыклад, Дзяржкамітэт па ахове прыроды. Пакуль гэта бяспраўная арганізацыя. Яна нічога не можа.

М. М. ШУМЕЙКА: У мяне канкрэтная прапанова. Ніякія дзеянні грамадскасці не вырашаць пытання, пакуль не будуць прыняты навукова абгрунтаваныя законы. Універсітэт таксама можа ўнесці свой уклад. У нас ёсць юрысты, эколагі — універсальны спектр спецыялістаў. Чаму б ім не распрацаваць праект закона па ўсіх параметрах — нітратах, радыяцыі і г. д., і вынесці яго на разгляд камісіі заканадаўчых меркаванняў? І сілай грамадскасці настойваць на выкананні гэтага закона.

А. І. ШАДЫРА: Я веру ў вялікую сілу грамадскасці. Але яе патрэбна ўзбройваць пэўнымі ведамі. Зараз яна адгукаецца толькі тады, калі нешта адбылося і маўчаць больш нельга. Наглядная сітуацыя — Чарнобыль. Усе разумелі, што людзей патрэбна высяляць. А што рабіць там, дзе ўзровень радыяцыі адносна невялікі? Стварылі вядомую ўсім канцэпцыю 35 бэр. Потым высветлілася, што жыць у гэтых раёнах небяспечна: пачасцілася розныя астматычныя і сардэчныя захворванні. І вось тады паднялася грамадскасць. Усе зразумелі: нешта тут не зусім добра атрымліваецца з гэтымі дапушчальнымі нормамі. Разабрацца на навуковым узроўні дапамог бы створаны ў БДУ цэнтр фундаментальных даследаванняў экалагічных праблем.

А. У. ТАМАШЭВІЧ: Сёння сур'ёзна гаварыць аб экалогіі можна толькі мовай эканомікі. У нас не хапае ў першую чаргу эканамічнай абароны прыродных рэсурсаў. Мы вырашаем пытанне: што будаваць? А хто ведае, на чыю карысць яго вырашыць? І атрымліваецца, што вялікая плошча ў нас занята непатрэбным будаўніцтвам. Гэтага можна было б пазбегнуць, увёўшы плату за прыродныя рэсурсы.

К. М. ЛАПКО: Не думаю, што кіраўнікі прадпрыемстваў, якія забруджваюць паветра, нейкія варвары. Проста яны пастаўлены ў такія ўмовы, што не могуць інакш. Грошы, якія даюць, не рэалізуюцца, таму што трэба знайсці падрадчыка. Няма і эфектыўных тэхналогій. Вось і вымушаны дырэктар завода глядзець на парушэнні скрозь пальцы.

В. ПАНЦЯЛЕЕЎ: Напэўна, я адзін прадстаўнік студэнцтва. Можа здацца, што маё выступленне неяк не ўпісваецца ў агульную карціну дыскусіі, тым не менш хачу задаць некалькі пытанняў.

У мінулым годзе студэнты розных ВНУ выязджалі на «бульбу» у Магілёўскую і Гомельскую вобласці. І даволі часта можна было назіраць прыкладна такую карціну: на гэты бок рэчкі студэнты ўбіраюць «другі хлеб», а на той — салдаты закопваюць у зямлю радыеактыўныя рэшткі.

Яшчэ адно пытанне: як быць з размеркаваннем? Ці маем мы маральнае права накіроўваць у экалагічна забруджаныя раёны маладых спецыялістаў, у той час, калі людзі ўсімі праўдамі-няпраўдамі стараюцца вырвацца адтуль? Магчыма, неабходна больш улічваць асабістае жаданне выпускніка?

Л. К. ГЕРАСІМАВА: Думаю, не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што экалогія выйшла сёння за рамкі біялагічных навук. Яна патрабуе намаганняў спецыялістаў усіх напрамкаў. Зараз, безумоўна, настаў момант увесці курс лекцый па ахове навакольнага асяроддзя, напрыклад, на фізічным факультэце. Гэта патрэбна нашай моладзі.

Мы маглі б заняцца і вывучэннем механізму ўздзеяння на арганізм розных арганічных злучэнняў, у прыватнасці, харчовых дабавак, арганічных фарбавальнікаў, некаторых лякарстваў...

А. М. РАЧЭЎСКІ: Нам вельмі патрэбны цэнтр па даследаванню экалагічных праблем. Больш таго, у Дзяржкамітэце па ахове прыроды ішла размова аб стварэнні такіх цэнтраў ва ўсіх ВНУ.

Мы атрымлівалі б буйныя заказы. Напрыклад, на адным з апошніх пасяджэнняў Дзяржкамітэта па ахове прыроды вельмі востра стаяла пытанне па Мінскаму аўтазаводу — выкіды забруджаных вод, выкіды шкодных рэчываў у атмасферу і г. д. Цэнтр дапамагаў бы хутчэй вырашаць існуючыя на прадпрыемствах праблемы.

Што датычыць выказанай тут думкі аб стварэнні пастаяннага камітэта пры Вярхоўным Савеце, то такі і цяпер існуе. Але, на жаль, спецыялісты, якія там працуюць, далёкія ад галіны аховы прыроды. Застаецца толькі спадзявацца, што сітуацыя зменіцца пасля выбараў.

Н. М. КРУЧКОВА: Хацелася б падтрымаць ідэю аб неабходнасці сур'ёзна ўзяцца за экалагічную адукаванасць насельніцтва. Не сакрэт, многія законы не выконваюцца іменна таму, што людзі нашы экалагічна неадукаваныя. Дарэчы, і ў нас, ва універсітэце. Наша кафедра выходзіла з прапановай выкладаць у БДУ асновы прыкладной экалогіі. Але пакуль справа з месца не зрушылася.

У сваю чаргу кафедра праводзіць вялікую асветніцкую дзейнасць. Арганізавалі экалагічныя канферэнцыі сярод старшакласнікаў, «круглыя сталы» на заводзе «Тэрмапласт», у НВА «Інтэграл». Удзельнічалі ў пасяджэнні клуба «Юнацтва» пад назвай «Экалогія, мараль, асоба». Зараз мы падрыхтавалі таксама да друку экалагічны слоўнік. Таму хацелася, каб і ва універсітэце да гэтай работы падыходзілі больш сур'ёзна.

А. М. ЛЮЦКО: Хачу заўважыць, што мы распрацавалі праграмы курсаў навучання савецкіх, партыйных і іншых кіраўнікоў, якія працуюць у раёнах, пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі. Не менш важна гэта і для работнікаў Дзяржаграпрома БССР, аховы здароўя.

Але навучанне азначае не толькі лекцыі. Каб атрымаць належны эфект, трэба мець добра абсталяваную лабараторыю. Нядаўна мы звярнуліся з гэтай прапановай да міністра народнай адукацыі БССР. Думаецца, пытанне экалагічнай асветы— адно з важнейшых, і каму, як не нацыянальнаму універсітэту, ім займацца.

Г. У. ГРУШАВЫ: Вы думаеце, дастаткова падрыхтаваць студэнтаў і навучыць работнікаў, якія займаюцца на месцах вырашэннем гэтых праблем, і нешта зменіцца? У дзяржаўнай праграме, якая зараз распрацоўваецца, асноўны прынцып — захаванне эканамічнай структуры пацярпеўшых абласцей. Калі прааналізаваць яе, то можна ўбачыць, што амаль 30 працэнтаў сродкаў пойдуць на стварэнне будаўнічых камбінатаў на Магілёўшчыне і Гомельшчыне, для таго, каб узвесці тут новыя вытворчасці і жаллё.

І яшчэ. Мне здаецца, самае важнае зараз — прадумаць новую стратэгію развіцця эканомікі. Яна не павінна вымярацца толькі працэнтамі, а ўжо з самага пачатку яе неабходна арыентаваць на экалагічную сітуацыю.

В. А. ГАЙСЁНАК: Удзельнікі дыскусіі закранулі сёння розныя аспекты экалагічнай праблемы. З таго, аб чым тут гаварылі, можна вызначыць тры асноўныя напрамкі, па якіх мы павінны працаваць. Першы — гэта экалагічнае асветніцтва. Другі — вырашэнне пытання са стварэннем экалагічнага цэнтра. Трэці — падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў.

Далей, патрэбна падумаць і аб экалогіі ўнутры універсітэта. Добра было б стварыць экалагічнае аб'яднанне, якое ўсур'ёз занялося б гэтымі пытаннямі.

Сёння мы клапоцімся пра сваіх дзяцей, унукаў. Адзін пакідае ім дачу, другі — машыну, трэці дапамагае атрымаць адукацыю. І ўсе разам забываем пра тое, што забіраем у іх чыстую ваду, свежае паветра, высякаем лясы,— карацей, пазбаўляем іх самага галоўнага багацця...

Матэрыялы падрыхтавала да друку
З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.



УВАГА: КОНКУРС!

ШУКАЙЦЕ І ЗНОЙДЗЕЦЕ

Даследчы цэнтр Дзяржадукацыі СССР па праблемах кіравання якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў аб'яўляе адкрыты конкурс на лепшую навуковую работу ў галіне метадалогіі развіцця універсітэцкай адукацыі як састаўной часткі цыкла даследаванняў па праблеме «Інтэлектуальная прафесійная дзейнасць, вышэйшая адукацыя і грамадскі прагрэс».

У конкурсе могуць удзельнічаць як творчыя калектывы, так і асобныя вучоныя, якія маюць навуковы задзел у дадзенай галіне.

Для заахвочвання пераможцаў конкурсу прадугледжаны фонд грашовых сродкаў — 1000 рублёў.

Лепшыя работы будуць рэкамендаваны да выдання ў СССР і за мяжой. З іх аўтарамі будуць заключаны працоўныя пагадненні на працяг даследаванняў у 1990 годзе.

Работы на конкурс павінны быць пададзены да 25 лістапада гэтага года на адрас: 105318, Масква, Ізмайлаўская шаша, дом 4, Даследчы цэнтр Дзяржадукацыі СССР па праблемах кіравання якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў. «На конкурс».

Даведкі па тэлефоне: 369-42-83.

Жадаючых азнаёміцца з патрабаваннямі да конкурсных работ просім звяртацца ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».

Н. СЕЛЯЗНЁВА, кіраўнік даследчага цэнтра.

ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ



у трынаццаты раз

БІЯФАК ПАЧЫНАЕЦЦА З...

У вестыбюлі стаяла пудзіла ў белым халаце. У руках — некалькі бутэлек, на шыі — гальштук, які адна знаходлівая студэнтка «пазычыла» ў свайго бацькі. Гэта — біёлагі! У іх пачыналіся Дні факультэта.

У бутэлькі, якія трымала пудзіла, усе жадаючыя кідалі паперкі з прозвішчамі выкладчыкаў. Так выбіралі: самага ўсмешлівага, самага вясёлага, самага прывабнага, самага раяльнага (элегантнага значыць) і самага... непрабіваемага. Каб кожны з іх атрымаў адпаведны прыз.

Білеты на апошнія Дні біяфака распаўсюджвалі на ўсіх факультэтах: сапраўды было на што паглядзець, асабліва тым, хто ў школе не любіў біялогію і з таго часу ўсіх біёлагаў лічыць сумнымі, нецікавымі людзьмі. Прэс-канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў — паглядзіце і пашукайце яшчэ дзе-небудзь такія жывыя, натуральныя адносіны студэнтаў і выкладчыкаў. Конкурс садова-паркавых скульптур і аўкцыён — можна толькі пазайздросціць такой неабсяжнай фантазіі і гумару. Калянавуковая канферэнцыя, біякарнавал. Амаль да ўсяго гэтага мелі прамое дачыненне ўдзельнікі БІЯТЭАТРА. Іх зорны час наступіў ў апошні вечар Дзён факультэта пры паўнюткай зале Палаца Белсаўпрофа.

ХТО ВЫЦЕРПІЦЬ ДВУХМЕСЯЧНАЕ СЯДЗЕННЕ...

47-мы аўтобус ездзіць аж за горад. Даволі доўга і марудна. Не шкадуеш зроку — чытай. А, можа, любіш глядзець у акно?

Яны ўжо чацвёрты раз сёння «вымяраюць» гэты маршрут: на заняткі, з заняткаў, на рэпетыцыю і дамоў. Не, гэта пакуль рэпетыцыяй не назавеш. Да выступлення яшчэ месяц. Яны збіраюцца ў вялікай аўдыторыі на першым паверсе і размаўляюць, размаўляюць — пакуль не нараджаецца патрэбная думка, фраза, слова... Так біятэатр рыхтуецца да чарговай сустрэчы з гледачамі.

Вы пачулі слова «біятэатр» упершыню, і:

— Я заўсёды марыла быць удзельніцай студэнцкага тэатра. Як трапіць туды, якія ўмовы і які конкурс?.. Вельмі люблю Чэхава — ці іграюць яго? А каго з сучасных?

Засмяяліся б яны на такія пытанні. І сціпла паведамілі б: іх мэта — некалькі разоў на год расказаць са сцэны што-небудзь смешнае. Прымаюцца — усе. Хто згодны пасябраваць з 47-м маршрутам, а галоўнае —хто здолее вытрымаць двухмесячныя сустрэчы па вечарах.

Ігар Сямашка не прапускае амаль ніводнай, хоць скончыў універсітэт яшчэ ў 1984 годзе і зараз — малодшы навуковы супрацоўнік АН БССР. Так і застаўся сярод самых актыўных «біятэатраўцаў», хоць часу зусім не хапае: акрамя работы яшчэ ў аспірантуры заняты. Яму цікава са студэнтамі,— так ён сам гаворыць.

«УСЁ ТРЫМАЕЦЦА НА ПЕСНЯКЕВІЧЫ»

Калісці ў свае студэнцкія гады Ігар Сямашка выконваў галоўную ролю ў пастаноўцы пад назвай «Ванька Жукаў— суперстар». Вось вам і Чэхаў... Але ў якой кампаніі! З архіпапулярнай рок-операй «Ісус Хрыстос — суперзорка», якую равеснікі Ігара ведалі на памяць, спявалі на англійскай мове пад гітару. Што толькі не прыдумаюць студэнты! Чэхава яны тады прымусілі сустрэцца і з пісьменнікам-фантастам С. Лемам: адзін спектакль называўся «Зорныя дзённікі «Ванькі Жукава».

Ігар лічыць, што тыя ўдзельнікі біятэатра былі цікавейшымі, чым сённяшнія: з большай фантазіяй, ініцыятывай, жаданнем знайсці новае, нечаканае... А зараз, на думку Ігара, усё трымаецца на Песнякевічы, кіраўніку і адным з заснавальнікаў біятэатра.

Сашу Песнякевіча на біяфаку ведаюць усе. Менавіта Сашу, хоць па ўзросту яго і па бацьку можна называць. Проста ён, навуковы супрацоўнік праблемнай лабараторыі эксперыментальнай біялогіі, у душы — студэнт. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова паназіраць за яго адносінамі з удзельнікамі біятэатра. Павага і раўнапраўе, узаемаразуменне, агульныя творчыя мэты.

Калі пры падрыхтоўцы да апошняга выступлення ўжо адчувалася, што «пасяджэнні» багатых вынікаў не абяцаюць, Песнякевіч прынёс рукапіс сваёй п'есы. Вершы да кантаторыі таксама сам напісаў, толькі песні падбіралі разам.

КАНТАТА + АРАТОРЫЯ=?

Не, такога слова вы яшчэ не чулі — кантаторыя! І як кантаторыя гучыць — таксама.

Уздымаецца заслона. На сцэне — харавая капэла, наперадзе два салісты і, вядома, дырыжор. За раялем канцэртмайстар, яму дапамагае скрыпачка (па традыцыі тут ансамбль з любой колькасці выканаўцаў называецца «аркестрам інструментаў народаў біяфака»). Дырыжор падымае рукі ўгору, і адначасова падымаюцца папкі, якія трымаюць спевакі. Кантаторыя — гэта чаргаванне вершаваных радкоў і ўрыўкаў з песень, якія ілюструюць гэтыя радкі. Вось саліст прачытаў некалькі строф аб папулярным сёння паняцці — плюралізме. І капэла адразу ж падхапіла: «И я, и я, и я таго же мнения...» Камічны эфект дасягаецца хутка — дзякуючы кантрасту паміж сур'ёзнымі творамі спевакоў, іх парадным адзеннем (традыцыйна — белы верх, чорны ніз) і зместам таго, што яны выконваюць.

Ролі размяркоўвалі ўсе разам, прачытаўшы тэкст п'есы. Асаблівых спрэчак не было: хто адчуваў, што пэўная роля — яго, браўся паспрабаваць. Безумоўна, аднаму даводзіцца іграць на сцэне амаль увесь час, пакуль ідзе пастаноўка, а другі выходзіць толькі аднойчы, каб, напрыклад, з'явіцца на базары ў якасці жыхара адной з закаўказскіх рэспублік і гучна прапанаваць усім муміё. Трэба сказаць толькі пару слоў. Але як жа гэта цяжка... Таму тут не крыўдуюць на маленькія ролі.

Апошняя пастаноўка біятэатра была прысвечана... госцю з іншай планеты. Яго голас пачынаў грымець, калі хто-небудзь з жыхароў камунальнай кватэры, дзе адбываецца галоўнае дзеянне, уключаў... прас. У канцы «голас з праса» выконваў усе жаданні: таму, хто занадта любіць грошы, падараваў рахунак у Швейцарскім банку, другому, які заўсёды насіў з сабой том Дастаеўскага, — усходнюю прыгажуню, што з'явілася пад мелодыю з «Ізауры» і адразу пачала цытаваць твор любімага пісьменніка свайго гаспадара...

Мабыць, апошняя кантаторыя біятэатра ў параўнанні з усімі ранейшымі была найбольш прасякнута сацыяльным напрамкам. Натуральна, гэта даніна нашаму часу. Пастаянныя гледачы біятэатра заўсёды прыходзілі на спектаклі, каб пачуць вострую думку, адчуць асалоду ад трапнага гумару. Але, як гаворыць Саша Песнякевіч, зараз усё больш складана здзівіць людзей словам са сцэны: «Жванецкага цяжка абысці. І студэнты сёння не тыя, што ўчора: меней творчых людзей, большасць — проста выканаўцы чужых задумак».

Падрыхтоўка кантаторыі стала традыцыяй, таму што такі жанр дазваляе задзейнічаць у выступленні ўсіх, хто прыходзіў на рэпетыцыі. І ў п'есу Саша ўключыў некалькі «масовак» з той жа мэтай— асноўных дзеючых асоб не можа быць многа.

А самай шчаслівай аказалася студэнтка біялагічнага факультэта Галя, якая здымала куток у гэтай камуналцы. Да яе, дзякуючы намаганням іншапланецяніна, завітаў памочнік дэкана (тут зала дружна смяялася з дакладнай пародыі) і ўручыў ордэр на пакой у інтэрнаце, дзе Галя будзе... пятай жыхаркай.

АСАБІСТАЕ ШЧАСЦЕ, ДЗЕ ТЫ?

Калі біялагічны факультэт размяшчаўся яшчэ ў хімічным корпусе, на хімфаку быў свой МХАТ — малы хіміка-аналітычны тэатр. Захацелася і біёлагам свой мець, толькі ўжо ГАБТ — галоўны атэістычны біятэатр. Адзін раз выступілі пад гэтай назвай, яна вельмі ўсім спадабалася. Але хутка ад яе засталася толькі апошняя частка — біятэатр.

Дзякуючы такой жа непаўторнай імправізацыі, з'явіўся і галоўны дэвіз біятэатра: «Толькі ў грамадскай рабоце можна знайсці асабістае шчасце!» (За 13 год існавання біятэатра на «яго базе» ўтварылася сем сямейных пар). Словамі дэвіза, дарэчы, заканчвалася адна даўняя пастаноўка. Галоўныя дзеючыя асобы, вымаўляючы гэту фразу, стаялі, як рабочы і сялянка з аднайменнай скульптуры Мухінай. Студэнты, якія выконвалі іх ролі, Барыс і Лена, потым сталі мужам і жонкай Ямінскімі, і інакш як «Мы — мінскія» іх ужо не называлі.

Таямніцу прыцягальнасці біятэатра можна адчыніць толькі часткова. Яна — у сінтэзе вострага слова, якое, аказваецца, можна так нечакана перайначыць, студэнцкага гумару, іранічнага і адначасова зацікаўленага погляду на ўсё, што адбываецца навокал. І дружалюбнасці, і працаздольнасці, і творчай рашучасці, і неабсяжнай любві да роднага факультэта, і вечнай цягі да зносін з цікавымі людзьмі.

Нерэальна, каб усім гэтым багаццем валодаў кожны ўдзельнік біятэатра, ды і навошта? Калі яны разам, побач са сваім Сашам Песнякевічам — яны як сонечны вогнік, які можа запаліць і іншых.

Ці ўдасца ім гэта? Ці ўдасца ім стварыць у сваім калектыве такую атмасферу, каб кожны, хто прыйдзе сюды, адчуў сябе ў сваёй тарэлцы, каб ніхто не баяўся быць самім сабой, каб кожны ведаў, што яго тут зразумеюць, падтрымаюць, дапамогуць?

Ці ўдасца ім стварыць такі калектыў, у якім кожны будзе ведаць, што ён не адзін, што ён — частка вялікага цэлага, што ён можа разлічваць на падтрымку і дапамогу

МАЙСТРОЎНЯ



КРОК НАПЕРАД

«Я здымаю ўсё падрад»

І наогул, хто я такі? Самы звычайны студэнт першага курса факультэта журналістыкі. Прывяло мяне ў фатаграфію жаданне паказаць свет такім, якім я яго бачу і ўяўляю. Нехта ўспрымае жыццё праз літаратуру, нехта праз музычныя творы, я — праз фатаграфію. Уражанні выліваюцца на адбіткі — візітныя карткі майго душэўнага стану. А здымаю я ўсё падрад. Гэта можа здацца крыху дзіўным, бо здымаць усё падрад можа любы чалавек. Але ў тым і заключаецца праца фотарэпарцёра, каб з гэтай «сырой» масы атрымаць выдатныя работы. Звычайна здымкам папярэднічае карпатлівая падрыхтоўка: праверка тэхнікі, абдумванне сюжэта, асноўнай лініі (лейтматыву). Кампазіцыя ж нараджаецца ў працэсе работы.

Расказваючы пра сябе, не магу не сказаць пра чалавека, які адкрыў для мяне свет фатаграфіі. Гэта кіраўнік майго фотаклуба Георгій Уладзіміравіч Багдановіч. Ён заўважыў ўва мне жаданне і здольнасці да работы з камерай. І ўжо праз кароткі час стаў даручаць мне адказныя здымкі і апрацоўку фотаматэрыялу. Як я тады хваляваўся, колькі рабіў памылак, непатрэбных рухаў! Але паступова набываў вопыт, станавіўся больш упэўненым. Сёння я вельмі ўдзячны свайму настаўніку за тое, што ён навучыў мяне па-новаму глядзець на свет і пры дапамозе фатаграфіі дзяліцца сваімі ўражаннямі з іншымі.

Я вельмі спадзяюся, што з цягам часу здолею наблізіцца да ўзроўню такіх майстроў айчыннай і замежнай фотажурналістыкі, як В. Вяткін, А. Шарсценнікаў, П. Крыўкоў, Э. Мітчал, Э. Адамс і многія іншыя. А пакуль наперадзе работа і работа...

А. МАЖАРА,
студэнт факультэта журналістыкі.

Паліна КАЧАТКОВА

НА ВАКЗАЛЕ

Юрасю здавалася, што яго сустракаюць. Ён марудзіў на платформе, у падземным пераходзе пільна ўглядаўся ў твары людзей, што стаялі ўздоўж сцяны. І нават на аўтобусным прыпынку Юрась азіраўся, шукаючы некага вачыма.

Было холадна. Вецер гнаў сыпкі снег, намятаў гурбы. Круцілася, пералівалася рознакаляровымі агеньчыкамі ёлка на прывакзальным пляцы.

У кватэры Юрася сустрэў кіслы, застаялы пах нежылога памяшкання. І Юрась, не распранаючыся, кінуўся адчыняць форткі: «Хай сабе скразняк, абы не гэты пах»,— думаў ён, ужо здымаючы пажоўклыя газеты з кніжных паліц. Уключыў у разеткі тэлевізар і халадзільнік і сеў задаволены ў крэсла. Нарэшце, дома, праўда, ненадоўга, але ўсё ж такі... У сваёй кватэры Юрась адчуваў сябе вольным, ад чаго — сам толкам не ведаў.

У дзверы пазванілі. Юрась пайшоў быў адчыняць, але спыніўся. Відаць, нехта памыліўся. Каму трэба званіць у пустую кватэру? Але званілі доўга і настойліва, не адрываючы рукі. Юрась мусіў адчыніць. На парозе стаяла дзяўчына ў чорнай футры.

— Праходзьце. Я сам толькі што прыехаў, яшчэ нічога да ладу не давёў,— глумачыў ён, дапамагаючы ёй распрануцца, і ўсё не мог згадаць — што гэта за дзяўчына. Ён правёў яе ў залу, пасадзіў у крэсла, дзе толькі што сядзеў сам.

— Марыя Вітольдаўна памерла,— прамовіла дзяўчына.

— Гора якое! Калі? — сказаў Юрась толькі дзеля таго, каб нешта сказаць і выгадаць час, бо зусім не памятаў, хто такая Марыя Вітольдаўна.

— Сёння днём,— адказала дзяўчына і заплакала.

Юрась паківаў галавой: ён усё ж прыгадаў, што Марыя Вітольдаўна — яго швагерка, а дзяўчына, відаць, яе ўнучка Вера.

— Яшчэ сёння глядзела, як я шары на ёлку вешала,— гаварыла Вера скрозь слёзы.— Але, ведаеце, цяпер свята, дык усе крамы пазачыненыя і кантора гэтая... Вы, Юра, прыйдзеце заўтра?

— Я заўтра ад'язджаю. А то прыйшоў бы. Я магу зранку падысці да маёй цёці. Яна дакладна прыйдзе.

Юрасёва цётка жыла на другім канцы горада, Юрась адчуў, што, схадзіўшы туды, ён ужо зробіць добрую справу. Вера пайшла. Але спакой быў парушаны. Юрась без мэты блукаў па кватэры, разглядаў змалку знаёмыя карціны на сценах, браў з паліц кнігі толькі для таго, каб паставіць іх на месца. Было прыкра і цяжка. Юрась падышоў да акна. Глядзеў, як вецер бесперастанна круціў дробны, сухі снег у чорным вечаровым паветры. У акне насупраць успыхнула ліхтарыкамі ёлка. «І мне трэба было б хоць якіх лапак у слоік паставіць. А то які ж Новы год, а тут яшчэ гэта... — думаў Юрась.— Я ж Марыю Вітольдаўну можа раз у жыцці бачыў — заносіў ёй вазоны, каб летам кветкі палівала». У памяці ўсплыла думка, якая калісь вельмі турбавала Юрася: «Чаму чалавек ніколі не можа адчуць ці хаця б уявіць чужога гора, болю? Ніколі. А калі ён прыходзіць, агортвае цябе, ты, адарваны ад усіх, застаешся з ім сам-насам, пазіраеш на свет, бы з глыбокай студні»...

Спаў мала і неспакойна, думкі пераліліся ў трывожныя сны: то бітыя вазоны з высыпанай зямлёю, то калядная каза бегала па кватэры і біла капытамі.

Раніцай пацішэла. Замятуха скончылася, паказалася сонейка. Юрась павольна ішоў ціхай старой вуліцай на ўскраіне горада, уздоўж аднапавярховых дамкоў з чырвонай цэглы. Пры яго набліжэнні з дрэў узляталі сініцы, атрэсваючы з папрыгінаных галін снег. Сняжынкі зіхацелі, пераліваліся на сонцы. Юрась усміхаўся, ён прыгадваў той час, калі ездзіў сюды кожны дзень пасля школы. Яго цётка вельмі любіла і пеставала катоў. У яе заўсёды было іх не менш пяці, акрамя гэтага каля яе дома збіраліся прыблудныя і суседскія каты, якіх яна таксама час ад часу прыкармлівала. А ўласна хатнія мелі на дзіва дагледжаны выгляд: тоўстыя, пухнатыя, з бліскучай поўсцю. Нават да цёткі яны не адчувалі ніякай удзячнасці: ні за сырызну, ні за супы, ні за цёплую печку. Юрась знаходзіў на печы сабе пацеху: ён асцярожненька праводзіў рукой па тлустых каціных спінах, тады па хвастах, дакранаўся пальцам да вільготных насоў. Каты злосна пыхцелі, білі хвастамі, паказвалі вострыя кіпці з-пад пульхных падушачкаў на лапах.

— Юра, што ты робіш з маімі катамі? — крычала цётка.

— Што ж ты ім такім зробіш? — смяяўся Юрась.

Потым прыходзілі бацькі і забіралі Юрася, каты скручваліся ў клубок, вярталіся да звыклага спакою на цёплай печы. З такімі ўспамінамі Юрась падышоў да цётчынага дома. Брамка была зачынена, і ён пагрукаў у акно. За фіранкаю прамільгнуў цень.

— Юра! А няўжо гэта ты? Зусім ты на мяне забыўся!

Цётка выбегла на двор, адчыніла брамку і зараз цягнула Юрася ў хату, не даючы сказаць слова.

— Сядай во сюды, да акенца, распавядай,— казала яна.

Юрась сеў, тужліва глянуў на заснежаныя дрэвы і прамовіў:

— Марыя Вітольдаўна памерла.

— Гора якое! А калі?

— Учора днём. Яшчэ зранку глядзела, як Вера шары на ёлку вешала, днём стала кепска і ўсё.

Цётка ківала галавой.

— Ты пойдзеш да іх? — спытаў Юрась.

— А як жа я, Юра, пайду? Да мяне зараз госці прыйдуць. Я пірагоў напякла. Можа і ты есці хочаш? — усхвалявалася цётка. Юрась спакойна адказаў: «Хачу». І сам сабе падзівіўся, бо прыйшоў усё ж такі паведаміць аб смерці.

Яны селі за стол. Юрась зноў каля акна, а цётка насупраць.

— І калі ты, Юрась, скончыш свой інстытут?

— Яшчэ год вучыцца.

— А тады?

— А тады буду працаваць.

— А дзе?

— Хто ж ведае, куды накіруюць. А як, цётка, твае каты?

Колькі іх у цябе?

— — Тры.

— Нешта мала!

— А паглядзі якія.

На печы Юрась знайшоў толькі аднаго ката. Ён ляжаў выпрастаўшыся, як дарагі каўнер, і не падаваў ніякіх прыкмет жыцця. Юрась правёў рукою па яго спіне, па пухнатаму хвасту, дакрануўся пальцам да носа. Патурбаваны кот злосна мяўкнуў, скруціў дугой хрыбціну.

— Юра, што ты яму зрабіў? — закрычала цётка, пачуўшы мяўканне.

— Хіба яму што зробіш?

Юрась саскочыў з печкі.

— Добра, я пайду. Вы, можа, ўсё ж такі сходзіце да Веры?

—. А ты пойдзеш?

— Я ж сёння ад'язджаю.

На вакзале Юрась паспрабаваў уявіць, што яго праводзяць, але не здолеў.

Міхась СКОБЛА

Юдава поле

Страшная ноч апусцілася на зямлю — павесіўся Юда. Ніхто не хацеў пахаваць яго, нават звяры і птушкі гідзіліся яго пачарнелага брыдкага цела, пазашываліся ў лясныя нетры. І толькі чарада чорных груганоў паквапілася на корм дармовы, і ўсчалася бойка за лепшы кавалак. Спрытнейшыя ды мацнейшыя похапкам ірвалі вантробы вісельніка, пілі чорную кроў і, цяжка варушачы крыламі, ляцелі прэч. Але не стала цела здрадніка іхняй ежаю, і, летучы, захліпаліся Юдавай крывёю груганы, і страшныя ваніты падалі на зямлю.

І там, дзе ўпала хоць адна кропля,— нараджаўся здраднік свайго народа.

О гора! На наш край кроплі Юдавай крыві падалі густым дажджом...

(Са славенскай прыпавесці).

Ад Дняпра-ракі да Заблудава,
ад Палесся і да Дзвіны
прасціралася Поле Юдава,
наша роднае Поле Юдава,
і кружляюць там груганы.

Там зямля, да ўсяго прывыклая,
(чула — рэха за небакрай!) —
«Карр! мы вочы азёраў
выклюем...
край карраем... караем каррай...»

Там праклёны чутны і пацеры,
а на лес, а на твар травы,
на прачыстае ўлонне Мацеры
кроплі падалі, кожнай мацеры,
чорнай Юдавае крыві.

І яе атрымаўшы ў спадчыну,
горка горбілася зямля,
І яшчэ ва ўлонні матчыным,
да народзін ва ўлонні матчыным,
слёзна плакала немаўля.

Нараджаліся— невідушчыя
і халодныя, бы ўюны,
і да белых грудзей дапушчаны,
цела Маці кусалі яны.

Высыпаліся з вокнаў шыбіны —
рагатаў на асіне шыбенік
і абгрызенай шыяй трос:
— Людцы любыя, я ўваскрос!

Не ўбаку ад гасцінца людната
на злачынны, на страшны пір
запрашае ўсіх Поле Юдава,
выгалошвае Поле Юдава
і зацягвае, нібы вір...

ЗА ІМГНЕННЕ ДА ВЯРТАННЯ Ў ГЭТЫ СВЕТ

Я пакінуў каханую.
Маці.
Забіў дошкамі
храм сваёй веры.

Адпусціў на волю ўсе вятры,
даверыўшы ім
родныя песні,
баёвыя гімны,
старадаўнія замовы
і запаветныя пацеры,
якія калісьці ведаў.

Кінуў у багну похвы ды меч.
Аддаў на забаўку малым
дзедаву сявеньку
і пайшоў...

...у апраметную,— здагадаліся
адныя...
...да пана бога,— мовілі іншыя...
...каб ніколі не вярнуцца.
Бо заўсёды
за імгненне
да вяртання ў гэты свет
я абавязкова згадваў,
што ў ім
мяне чакае толькі радзіма.

Адчуваючы з жахам,
што нават гэтага
для мяне недастаткова...

ПАЭТЫ

Было: ад продкаў люд адрокся
і здрадзіў звычаям старым.
Згубіў свой шлях на паўдарозе,
бо
ўсе шляхі вядуць у Рым,
а рэкі ўсе цякуць да Леты...
І засталіся там адны
два-тры тутэйшыя Паэты,
жаўнеры ў полі без вайны...

І зоры кінулі раіцца
над занядбаным краем тым,
і перасталі біць крыніцы,
павыпаўзалі з нор краты...

І стала страшна ў краі гэтым...
А па засьмяглых вуснах рэк
брылі, як прывіды, Паэты
на бляск агню
ў пячорны век.

Раскашавалі ў пушчах совы.
І ратавалася ў агні
ад кіпцюроў драпежных
Слова —
маўчаць Паэты не маглі.
А бог на сонечных нябёсах
глядзеў з пагардаю на іх —
напаўсляпых, галодных, босых,
ды да яго пагроз глухіх.

Агмень бунтарны не згарае.
І бог на морак, ноч і тло
яшчэ наслаў
анёлаў зграю,
каб патушылі
іх святло.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
19 кастрычніка
Зак. 1633.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.